Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ЯК ПРАВІЛЬНА АБРЭЗАЦЬ ПАВОЙНІК

Інструкцыя па абразанні павойніка ў залежнасці ад часу цвіцення і ўзросту парасткаў, на якіх утвараюцца кветкі

Нельга скласці адзін універсальны спіс патрабаванняў да правядзення абрэзкі для ўсіх відаў і сартоў павойніка. У залежнасці ад таго, цвіце куст на парастках гэтага ці мінулага года, кветкаводы дзеляць павойнікі на тры групы, кожную з якіх неабходна абрэзаць па-рознаму.

Усе без выключэння маладыя расліны патрабуюць моцнай абрэзкі ў канцы першай вясны свайго жыцця. Падчас гэтай працэдуры куст абразаецца да вышыні 15—30 см. Не будзем закранаць самай першай абрэзкі павойніка, а засяродзімся на ўсіх наступных абрэзках.

Першая група абрэзкі

Да першай групы адносяць павойнікі, якія цвітуць вясной на леташніх парастках. Абрэзаць такія кусты варта адразу пасля заканчэння цвіцення. Адцвілыя парасткі кароцяцца на палову сваёй даўжыні.

Старыя галіны, як правіла, не маюць патрэбы ў штогадовай абрэзцы. Дастаткова раз у 2 гады караціць чацвёртую частку парасткаў, каб не дапусціць загушчэння. Калі ж куст занадта пышны, яго ўсё-такі давядзецца прарэджваць штогод.

У групу 1 уваходзяць павойнік горны, павойнік буйнапялёсткавы (макрапетала), павойнік альпійскі, павойнік квяцісты, павойнік Патэнс, павойнік Фларыда.

Другая група абрэзкі

Павойнікі гэтай групы — пераважна буйнакветкавыя гібрыды, якія цвітуць у пачатку лета на кароткіх парастках леташняга прыросту. Калі не праводзіць іх рэгулярную абрэзку, неўзабаве кусты стануць неахайнымі, загушчанымі, а кветкі здрабнеюць.

Павойнікі 2-й групы абразаюць ранняй вясной, да таго, як пупышкі паспеюць прачнуцца і кранецца ў рост. Прафілактычная абрэзка дапаможа раслінам «кінуць усе сілы» на меншую колькасць парасткаў, дзякуючы чаму цвіценне будзе больш пышнае.

Праўда, абразаць куст варта без фанатызму: калі выдаліць занадта шмат парасткаў, цвіцення летам можна так і не дачакацца. Дастаткова будзе абрэзаць практычна дашчэнту ўсе галіны, якія растуць унутр, і на траціну абрэзаць слабыя парасткі.

Калі павойнік цвіце двойчы за сезон, пасля першай хвалі цвіцення неабходна правесці паўторную абрэзку. У гэтым выпадку адцвілыя парасткі кароцяцца да пупышкі ніжэй суквецця.

Да групы 2 адносяць павойнік ланугіноза, а таксама некаторыя гібрыды павойніка Фларыда і Патэнс.

Трэцяя група абрэзкі

Сюды адносяцца ўсе павойнікі, якія цвітуць у канцы лета — пачатку восені на парастках гэтага года. Яны лёгка і хутка разрастаюцца, пры гэтым суквецці ўтвараюцца толькі на маладых парастках, а старыя галіны пачынаюць нагадваць зблытаны «клубок».

Каб не дапусціць гэтага, ранняй вясной усе леташнія прыросты абразаюць да адной або двух пупышак. Маладыя парасткі, якія ўтварыліся ўнізе куста, выдаляць не трэба. А ўсе старыя і хворыя галіны неабходна выразаць.

У групу 3 уваходзяць павойнікі Вітцэла, Жакмана, павойнік прамы, павойнік тэксенсіс, павойнік усходні, павойнік тангуцкі, павойнік разналісты.

Калі вы не можаце зразумець, да якой групы адносіцца расліна вашага сорту, ужывайце камбінаваную абрэзку: адзін парастак пакіньце вышынёй 1,5 м, а той, які расце побач — абрэжце да 2—4 пупышак. Астатнія галінкі пакараціце гэтак жа — праз адну.

Абрэзка на зіму

Восеньская абрэзка павойнікаў патрэбна для таго, каб добра атуліць расліну і дапамагчы ёй паспяхова перазімаваць. Павойнікі абразаюць у канцы кастрычніка — пачатку лістапада. Важна паспець зрабіць гэта пры добрым надвор'і.

У першы год жыцця пры падрыхтоўцы да зімы ўсе павойнікі абразаюць аднолькава: пакідаюць адзін галоўны парастак вышынёй 20—30 см.

У наступныя гады ў павойнікаў першай групы на зіму пакідаюць парасткі даўжынёй 1,5—2 м — у іх абразаюць толькі вяршкі. Павойнікі другой групы абразаюць трохі карацей: пакідаюць парасткі вышынёй 1,2—1,5 м. Расліны, якія адносяцца да трэцяй групы, цвітуць толькі на маладых парастках, таму восенню ў іх абразаюць усе галінкі, пакідаючы 2-3 пупышкі вышэй узроўню зямлі.

Таксама ў раслін усіх груп выдаляюць лісце, усе сухія, паламаныя, хворыя і старыя галінкі.

Каб прадухіліць распаўсюджванне грыбковых хвароб, рэкамендуецца да наступлення замаразкаў апырскаць каранёвую шыйку павойніка 1-працэнтным растворам бардоскай вадкасці.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.41	21.36	16.55
Віцебск —	4.22	21.34	17.12
Магілёў —	4.31	21.27	16.56
Гомель —	4.36	21.14	16.38
Гродна —	4.58	21.50	16.52
Брэст —	5.07	21.41	16.34

Месяц

Апошняя квадра ў 21.32. Месяц у сузор'і Рыб.

Імяніны

Пр. *Івана, Мікіты, Сцяпана, Сямёна, Фёдара.*
К. *Марыі, Паўліны, Лаўрэнція, Нікіфара, Сымона.*

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

6 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1833 год — пачалося будаўніцтва Брэсцкай крэпасці. Крэпасць размяшчалася на чатырох астравах, утвораных рукавамі рэк Мухавец і Заходні Буг і сістэмай каналаў. Складалася з Цэнтральнага ўмацавання (Цытадэль) і Цярэспальскага, Валынскага і Кобрынскага ўмацаванняў. Па знешняй лініі крэпасці праходзіў земляны вал вышынёй 10 м з цаглянымі казематамі, за якімі былі пракапаны каналы з перакінутымі цераз іх мастамі. З сакавіка 1918 года ў Белым палацы крэпасці быў падпісаны Брэсцкі мір. 22 чэрвеня 1941 года гарнізон Брэсцкай крэпасці прыняў першыя ўдары нямецка-фашысцкіх захопнікаў і больш за месяц утрымліваў абарону. Вызвалена 22 ліпеня 1944-га ў ходзе Люблін-Брэсцкай аперацыі. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 8 мая 1965 года прысвоіў Брэсцкай крэпасці ганаровае званне «Крэпасць-герой». У 1971 годзе адкрыты мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой».

1841 год — нарадзілася (маёнтак Мількаўшчына, цяпер у Гродзенскім раёне) Эліза Ажэшка, польская пісьменніца. У час паўстання 1863—1864 гадоў была сувязной партызанскага атрада Р. Траўгута, які дзейнічаў у Беларускім Палессі. Аўтар апавяданняў «Рэха», «Тадэвуш», «У зімовы вечар», аповесцяў «Нізіны», «Хам», рамана-эпапеі «Над Нёманам». Інсцэніроўкі яе твораў неаднаразова ішлі ў тэатрах Беларусі. Па аповесці «Хам» пастаўлены аднайменны шматсерыйны тэлефільм. Памерла ў 1910 годзе. У г. Гродна ўстаноўлены помнік пісьменніцы, яе імем названа адна з галоўных вуліц.

У свеце

1888 год — нарадзіўся Валяр'ян Уладзіміравіч Куйбышаў, савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч. Унёс вялікі ўклад у арганізацыю сацыялістычнай эканомікі краіны. З 1930 года — старшыня Дзяржплана СССР, намеснік старшыні СНК і СПА СССР. Пад яго кіраўніцтвам распрацаваны канчатковы варыянт плана 1-й пяцігодкі. Пры яго ўдзеле разгортвалася будаўніцтва Сталінградскага трактарнага завода, Магнітагорскага і Кузнецкага металургічных камбінатаў, Горкаўскага аўтазавода, Днепрагэса. Узначальваў камісію па распрацоўцы плана 2-й пяцігодкі. Адзін з ініцыятараў 1-га выдання Вялікай Савецкай Энцыклапедыі і член яе Галоўнай рэдакцыі. Памёр у 1935 годзе.

1903 год — нарадзіўся Арам Ільіч Хачатуран (1903—1978), савецкі кампазітар, дырыжор, педагог, народны артыст СССР. Аўтар балетаў «Гаянэ», «Спартак», музыкі да драмы «Маскарад» Міхаіла Лермантава, спектакляў «Макбет», «Кароль Лір», музыкі да многіх кінафільмаў. Лаўрэат Ленінскай і чатыры разы — Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1978 годзе.

1966 год — ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прынялі пастанову «Аб грамадскім прызыве моладзі на важнейшыя будоўлі пяцігодкі».

УСМІХНЕМСЯ

— Бэрымар, што ў нас на сняданак?
— Аўсянка, сэр.
— А на абед?
— Аўсянка, сэр.
— А на вячэру?
— Катлеты, сэр.
— Цудоўна, а з чаго?
— З аўсянкі, сэр.

Студэнты дзеляцца на тры віды: фурманы, яшчаркі і сабакі.

Фурманы выязджаюць на тройках.

У яшчарак толькі адзін хвост адваліцца — вырастае іншы.

У сабак вочы разумныя, але сказаць нічога не могуць.

— Афіцыянт, у мяне ў супе муха!
— Як вы, вегетарыянцы, мяне дасталі...

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2201. Нумар падпісаны ў 19.30 5 чэрвеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12